# Берасцейскі універсітэт

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 13 (133)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
1 красавіка 2010 года

## Сёння ў нумары:


- **Арт-вакацыі–2010**
  Рэпартаж з першага туру Рэспубліканскага конкурсу творчасці студэнтаў ВНУ шукайце на стар. 2
- **Нашы навіны**
  Сачыце за апошнімі падзеямі універсітэта на стар. 2–3
- **Ці чыстая парта?**
  Вынікі рэйд-праверкі вучэбных аўдыторый, якую правяла бытавая камісія прафкама студэнтаў, знойдзеце на стар. 4
- **Патрэбны людзі**
  Пра свае ўражанні ад паездкі ў Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі «Стымул» расказвае студэнтка юрыдычнага факультэта М. Краўчук стар. 5
- **Акунаючыся ў філалогію**
  14-ты раз факультэт замежных моў прымаў высокіх гасцей стар. 6
- **Памяці калегі**
  Вынікі спаборніцтваў па падлёднай лоўлі рыбы апублікаваны на стар.8


# Мы начинаем фестиваль



***23 февраля стартовал республиканский фестиваль-конкурс художественного творчества студентов вузов «Арт-вакации–2010».***

***Началом торжества молодёжного творчества республики стал митинг с участием студенчества Брестчины. Очень символично, что фестиваль взял старт именно у священных руин Брестской крепости и Вечного огня. Ведь здесь были сделаны первые шаги к долгожданной победе, давшей нам возможность жить под мирным небом.***

***Представители республиканского оргкомитета фестиваля, облисполкома, руководства университетов, студенты возложили цветы к гранитным плитам, под которыми покоится 962 солдата. По окончании митинга фестивальные мероприятия переместились в ЦМТ.***

*Е. Басалай*
*(биологический факультет)*

ПАДЗЕЯ

# АРТ-ВАКАЦЫІ-2010

**«Балада пра чатыры стыхіі» – канцэртная праграма пад такой назвай 23 сакавіка паўстала на суд журы Рэспубліканскага конкурсу творчасці студэнтаў ВНУ «Арт-вакацыі–2010». Дэвіз фестывалю – «Свяшчэнны агонь Вялікай Перамогі аб'ядноўвае моладзь Беларусі» – проста абавязваў, каб у конкурсных выступленнях у той ці іншай ступені прысутнічала ваенная тэматыка (фота 3).**

Кожны з універсітэтаў Брэсцкай вобласці выступаў як асобная стыхія ў агульнай праграме. БрДУ імя А.С. Пушкіна, які адкрываў канцэрт, увасабляў агонь.

Думаецца, канцэрт не пакінуў абыякавым нікога: жанравы і тэматычны ахоп нумароў аказаўся настолькі шырокім, што і самы спакушаны глядач мог знайсці кампазіцыю на свой лад і густ.

Прыемна здзівіў наш новы калектыў «Кола» (на фота 1; мастацкі кіраўнік – К. Леванюк) з амаль аднайменнай песняй «Каціся, кола!». Слухала і думала пра тое, наколькі прывыклі мы да апрацаваных рэчаў па народных матывах, што і забыліся, як спяваюцца сапраўды народныя песні. Было б цудоўна, каб нагадвалі нам пра гэта часцей.

Дастукаліся да глыбіні душы і У. Круцікаў са сваёй «Бітвай», і студэнтка псіхолага-педагагічнага факультэта Я. Буцкевіч з песняй «Гісторыя аднаго кахання», напісанай, дарэчы, на музыку старшыні журы – заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Л. Захлеўнага. Новым творам парадаваў ансамбль акардэаністаў «Захапленне». Амбіцыёзнае трыо (на фота 2) не здрадзіла звычайнаму мажорнаму тону і з кампазіцыяй «Танцуй, маладосць!» накіравала ў залу вялікі зарад пазітыву, выклікаўшы ў адказ шквал апладысментаў. Запамінальнай, вартай фіналу была песня «Я за цябе малюся, Беларусь» у выкананні народнага вакальнага ансамблю «Новая зямля» пад кіраўніцтвам Л. Борсук.

У праграме іншых ВНУ таксама нямала цікавых нумароў, аднак мяне больш за ўсё ўразіў хор чытальнікаў БрДТУ. Цудоўная, як падаецца, ідэя выкарыстаць прыём паліфаніі і фотасуправаджэнне.

Фестываль толькі пачаў крочыць па абласцях краіны, і невядома пакуль, хто ад Берасцейшчыны будзе прымаць удзел у гала-канцэрце. Такая інтрыга будзе захоўвацца да таго часу, пакуль журы не прагледзіць творчыя праграмы ўсіх абласцей. Будзем спадзявацца, што «Арт-вакацыі–2010» будуць не менш плённымі для нашага універсітэта і рэгіёна, чым «Арт-вакацыі–2008».

P.S. Канцэртная праграма «Арт-вакацыі–2010» паклала пачатак штогадоваму фестывалю творчасці студэнтаў нашай alma mater «Студэнцкая вясна». Сачыце за выхадам наступнага нумару газеты «Берасцейскі універсітэт», дзе вас чакаюць рэпартажы з разнастайных мерапрыемстваў фестывалю.

*І. Хоміч*



Фота 2


Фота 1


Фота 3

## НАШЫ НАВІНЫ

*27 сакавіка наш універсітэт праводзіў Дзень адчыненых дзвярэй для вучняў выпускных класаў сярэднеадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў.*

● ● ●

*26 сакавіка прайшла VII Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя навучэнцаў і студэнтаў «Грамадзянскае выхаванне моладзі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі». Арганізатары канферэнцыі – кафедра педагогікі і аддзел па справах моладзі Брэсцкага гарвыканкама.*

● ● ●

*25 сакавіка адбылася сустрэча інфармацыйна-прапагандысцкай групы Брэсцкага гарвыканкама на чале са старшынёй гарвыканкама А.С. Палышанковым са студэнтамі біялагічнага факультэта. Тэма сустрэчы – «Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў як фактар павышэння эфектыўнасці працы мясцовага кіравання і самакіравання».*

*26 сакавіка прайшла адзіная гадзіна інфармавання на аналагічную тэму, дзе выступіў дацэнт кафедры паліталогіі і сацыялогіі С.Ц. Кавецкі.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ?

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

16 марта руководители правительств Беларуси и России С. Сидорский и В. Путин приняли участие в очередном заседании Совета министров Союзного государства, которое в этот раз прошло в Бресте.

На заседании обсуждались вопросы практического взаимодействия экономик двух стран в рамках Союзного государства, ход углубления интеграции. Среди намеченных к рассмотрению вопросов были: итоги торгово-экономического сотрудничества Беларуси и России в 2009 г., выполнение плана совместных действий правительств двух стран по минимизации последствий финансового кризиса, плана мероприятий по формированию и функционированию объединенной транспортной системы Союзного государства на 2008–2010 гг., реализация договора между двумя странами о сотрудничестве в области социального обеспечения, работа Таможенного комитета Союзного государства, сближение законодательств Беларуси и России.

Также обсуждался ход работы по проведению согласованной политики в области технического регулирования, стандартизации и метрологии, проект научно-технической программы Союзного государства «Повышение эффективности пищевых производств за счёт переработки их отходов на основе прогрессивных технологий и техники» на 2010–2012 гг.

● ● ●

2 апреля – День единения народов Беларуси и России.

Именно 2 апреля 1996 г. А. Лукашенко и Б. Ельцин подписали в Москве двухсторонний договор о Содружестве Беларуси и России, что стало важным шагом на пути единения двух родственных народов после распада СССР.

Через год, 2 апреля 1997 г., подписан ещё один документ – Договор о Союзе Беларуси и России, который дал новый импульс для процесса интеграции двух государств.

Кстати говоря, на сегодняшний день наш университет сотрудничает с 10 российскими вузами.

Одно из последних соглашений – с Московским гуманитарно-экономическим институтом – заключено в июне 2009 г.

● ● ●

15 марта А. Лукашенко направился с официальным визитом в Венесуэлу. По итогам визита подписано 22 соглашения о сотрудничестве в области торговли, сельского хозяйства, энергетики и строительства.

Из Венесуэлы 22 марта белорусский президент направился в Бразилию, где встретился со своим коллегой Луисом Инасиу Лулой да Силвой. По итогам переговоров принято решение, что Беларусь и Бразилия создадут торгово-экономическую комиссию и откроют посольства.

# НАШЫ НАВІНЫ

***31 сакавіка адбыўся чарговы Савет універсітэта, на якім абмяркоўвалася пытанне «Аб стане і перспектывах развіцця сацыяльна-педагагічнага факультэта». Са справаздачай выступіў дэкан факультэта А.М. Герасевіч.***

● ● ●

***26 сакавіка прайшла студэнцкая міжфакультэцкая навукова-практычная канферэнцыя «Анатама-фізіялагічная адаптацыя арганізма чалавека ў сучасных умовах акаляючага асяроддзя», праведзеная кафедрай анатоміі, фізіялогіі і бяспекі чалавека.***

● ● ●

***25 сакавіка прайшоў навукова-практычны семінар для выкладчыкаў юрыдычнага факультэта «Актуальныя праблемы прававога рэгулявання і парадку вырашэння спрэчак» з удзелам прафесара Дэйла Кайрэслі (Цэнтр міжнародных юрыдычных даследаванняў, ЗША).***

● ● ●

***Кафедра заалогіі і генетыкі біялагічнага факультэта 25 сакавіка арганізавала рэгіянальную студэнцкую навукова-практычную канферэнцыю «Стан прыроднага асяроддзя Палесся і сумежных тэрыторый».***

● ● ●

***24 сакавіка ў канферэнц-зале аблвыканкама праходзіла пасяджэнне калегіі ўпраўлення адукацыі абласнога выканаўчага камітэта. У працы калегіі паўдзельнічалі навучэнцы педспецыяльнасцяў БрДУ імя А.С. Пушкіна, уключаныя ў перспектыўны кадравы рэзерв.***

***Студэнты мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з сістэмай дашкольнай і сярэдняй адукацыі знутры, у тым ліку праз асэнсаванне праблем, якія ў ёй існуюць. У прыватнасці, шмат увагі на калегіі надзялілі пытанню шостага школьнага дня і траўматызму школьнікаў і дашкалят.***

## ФОТАФАКТ

***17 сакавіка прайшлі заняткі «Выхаванне студэнцкай моладзі (сацыялагічны аспект)» у межах навукова-метадычнага семінару «Выхаванне ў вышэйшай школе: метадалогія, прынцыпы і спосабы ажыццяўлення».***

***Перад выкладчыкамі і спецыялістамі універсітэта выступіў прафесар кафедры філасофіі В.А. Сцепановіч (на фота).***



## ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

*Первичная профсоюзная организация студентов БрГУ имени А.С. Пушкина*
*profstud.brsu.brest.by*

**Всякая перемена прокладывает путь другим переменам.**
**Николло Макиавелли**

Вот и у нас в составе профкома студентов произошли некоторые перемены, которые, как мы надеемся, станут предвестниками плодотворной работы в будущем!

Проведены отчётно-выборные профсоюзные конференции на факультетах социально-педагогическом, иностранных языков, географическом и биологическом.

Профбюро факультетов отчитались о проделанной работе, а также наметили планы на будущее. На конференциях избраны новые составы профбюро, в том числе и их председатели: Ольга Доропей (социально-педагогический факультет), Ольга Ващук (факультет иностранных языков), Александр Миронович (географический факультет) и Анастасия Панасюк (биологический факультет).

P.S. Спустя буквально неделю после избрания на должность я попросила поделиться впечатлениями о своей новой деятельности О. Доропей:



*На фото: бывший, А. Круг, и новый, О. Доропей (слева), председатели профбюро социально-педагогического факультета с заместителем декана по воспитательной работе Л.А. Скиндер*

**– Оля, ты уже почти месяц профсоюзный лидер на своём факультете. Скажи, что-то поменялось в твоей жизни?**

– Да, и прежде всего распорядок дня (*улыбается. – М.Б.*). Мне ещё трудновато вникнуть в суть дела, но я стараюсь. Сразу же появилось много приятных знакомств. В профкоме студентов университета замечательный председатель и коллектив. В этом я уже убедилась!

***М. Буховецкая***
***(юридический факультет)***

# ЧИСТАЯ ЛИ ПАРТА?

**С 15 по 19 марта бытовая комиссия профкома студентов провела рейд-проверку учебных аудиторий университета в рамках акции «Моя самая блестящая парта».**

Не описывая детали проверки, можно сразу сказать, что студентам совсем не удалось сохранить парты (особенно в аудиториях 702, 704, 708, 629, 527, 420 учебного корпуса № 1) в эстетическом виде. На них встречались шедевры сюрреалистов, абстракционистов, а также работы авторов современных течений живописи – в частности, неогеометрического концептуализма. Да, товарищи, да! Культура нас всеобъемлет…

Хочется также обратить внимание на тонны жвачек, приклеенных на внутренней стороне столов. Складывается ощущение, что студенты ничего, кроме жвачек, уже не едят и что тяжело им, пенсионерам, подойти к мусорному ведру. Ну что ж, придётся нам в апреле собраться-таки на субботник. О времени его проведения мы сообщим вам дополнительно.

***А. Богачук***
***(факультет иностранных языков)***




***Фрагменты студенческого творчества на одной из парт***

# И оркестр заиграет!

**Для укрепления любой организации необходима сплочённая работа всех её членов. А руководитель заинтересован, чтобы в команде царила гармония и чтобы «оркестр заиграл, а не слышались лишь разрозненные звуки отдельных инструментов».**



18 марта для членов профсоюзного комитета студентов был организован психологический тренинг, девиз которого – узнать и подружиться. Ведь в комитете появились новые лидеры, поближе познакомиться с которыми желали все.

Это было здорово! Ты узнаёшь много нового про человека, сидящего рядом. А задание педагога-психолога Л.В. Клюевой – создать свой журнал и продумать его презентацию и раскрутку – подтолкнуло многих к курьёзным идеям. У нас что-то получилось, хотя Людмила Витальевна и раскритиковала нас хорошенько.

В конце мы благодарили самих себя и психологов за работу. Ведь каждый хоть на чуточку, но стал ближе друг к другу в этот вечер!

***М. Буховецкая***
***(юридический факультет)***

## РАБІЦЬ ДАБРО

# НУЖНЫ ЛЮДИ

**А Вам слабо смешать три больших набора пазлов в одну кучу, а потом в течение всего нескольких часов сложить три идеально правильные картинки? А вот этот мальчик может! И когда он занят этим уникальным процессом, ничто вам не скажет, что у него есть какие-то проблемы в развитии. А они, к сожалению, есть…**

Этот мальчишка занимается в Центре коррекционно-развивающего обучения и реабилитации «Стимул», который активисты первички БРСМ нашего университета совместно с городским комитетом БРСМ и представителями первичек организаций и предприятий города посетили 18 марта.

В Центре обучаются дети разных возрастов: есть и дошкольная группа, и дети среднего школьного возраста. Стоит отметить, это не только ребята с особенностями умственного развития, но и те, чей интеллект ничуть не ниже, а порой даже и выше интеллекта ребят из обычных общеобразовательных школ. Просто передвигаются эти дети исключительно с помощью инвалидных колясок… Очень жаль, что в наших школах пока не созданы условия для разных детей.

Студенты юридического факультета и факультета физического воспитания показали деткам кукольную сказку «Зайкина избушка», за что были вознаграждены бурными аплодисментами. Гости также порадовали ребят сладкими подарками и игрушками.

Директор Центра О.А. Черненко, высказав слова благодарности организаторам мероприятия, обратилась к нам с просьбой организовать волонтёрские отряды для оказания физической помощи по благоустройству прилегающей к Центру территории для организации досуга детей. А ещё хотелось бы показать этим детям не только красоты нашего города, но и вывезти их за пределы Бреста… Транспортный вопрос не стоит – нужны люди, которые смогли бы сопровождать деток.



А ещё просила просто адекватно реагировать на таких детей, не корчить привередливые гримасы при их виде…

P.S. Если у вас есть какие-то предложения или просто желание помочь ребятам, обращайтесь в комитет п/о ОО БРСМ университета (каб. 630 учебного корпуса № 1). Будем очень рады!

*М. Кравчук*
*(юридический факультет)*

## КРАСАВІК У ГІСТОРЫІ

*01.04.1579 г. – заснаваны Віленскі універсітэт.*

*04.04.1500 г. – партугальскі мараплавец Педру Кабрал адкрыў Бразілію, прыняўшы яе за востраў.*

*07.04.1348 г. – У Празе заснаваны Карлаў універсітэт – адзін з найстарэйшых у Еўропе і першы славянскі.*

*07.04.1948 г. – стаў правамоцным статут Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Гэты дзень цяпер адзначаецца як Сусветны дзень здароўя.*

*09.04.1667 г. – у Парыжы адбылася першая ў свеце публічная выстава мастацтваў.*

*10.04.1833 г. – пачалася вытворчасць запалак.*

*12.04.1961 г. – першы ў свеце палёт чалавека ў космас, ажыццёўлены Ю. Гагарыным.*

*13.04.1980 г. – пасля 101 гадзіны гульні завяршыўся самы доўгі ў гісторыі матч па настольным тэнісе.*

*14.04.1871 г. – у Германіі заснаваны парламент – рэйхстаг.*

*14.04.1912 г. – суперлайнер «Тытанік» наткнуўся на айсберг.*

*16.04.1871 г. – Берлін абвешчаны сталіцай Германіі.*

*21.04.753 да н.э. – гэты дзень па легендзе лічыцца датай заснавання Рыма Ромулам.*

*22.04.1370 г. – закладзены першы камень у падмурак Бастыліі.*

*22.04.1972 г. – Сільвія Кук і Джон Файерфакс – першыя людзі, якія перасеклі Ціхі акіян на вяслярнай лодцы, – прыбылі ў Аўстралію. У моры яны правялі 362 дні.*

*26.04.1986 г. – аварыя на Чарнобыльскай АЭС.*

*30.04.1945 г. – пачатак штурму савецкімі войскамі рэйхстагу падчас Берлінскай аперацыі. Вызваленне вязніц жаночага канцлагеру «Равенсбрук».*

*В. Бялюк*
*(гістарычны факультэт)*

## НАТАТКІ ВЫКЛАДЧЫКА

# СТУДЭНТЫ ЖАРТУЮЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак у № 11)*

«Яшчэ ў часы існавання Беларусі ў складзе Польшчы забаранялася беларуская мова і *прышчымлівалася* беларускамоўнае насельніцтва».

«У часы Рэчы Паспалітай распаўсюджвалі польскую мову. *Але беларусы сабіраліся ў гурткі і там паміж сабой размаўлялі на беларускай мове*».

«Некаторыя вучоныя лічуць, што беларуская мова ўзнікла часткова і ад польскай, часткова і ад рускай мовы. Некаторыя з іх нават дадаюць, што беларуская мова – гэта сумесь не толькі рускай і польскай моў, але і нават літоўскай і украінскай».

«У 30–50-я гг. (20 ст.) *плённа вымушаны былі рабіць* Я. Колас, таксама такія пісьменнікі як Лужанін, К. Крапіва і інш.»

«У 1989 г. было створана Таварыства беларускай мовы *пад кіраўніцтвам* Ф. Скарыны».

«У *1995 г.* беларуская мова стала другой дзяржаўнай мовай на Беларусі».

«Трэба сказаць і пра вялікіх людзей, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці беларускай мовы: Кірыл і Мяфодзій, Скарына, Будны, Тарашкевіч (і яго *Тарашкевіца*)...». «Тарашкевіца – гэта *жонка* Б. Тарашкевіча».

«У *XIX* ст. Ф. Скарына надрукаваў першую кнігу на роднай мове».

*А.В. Макарэвіч*
*(дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі)*

## НА СВАЕ ВОЧЫ

# ОКУНАЯСЬ В ФИЛОЛОГИЮ

**12 марта вот уже 14-й раз факультет иностранных языков радушно принимал гостей, прибывших из всех гуманитарных университетов республики, и из университетов других стран.**

«Как приятно видеть среди присутствующих не только научных сотрудников, которые, как говорится, собаку съели на этом поприще, но и начинающих исследователей, которые только готовятся ступить на эту непростую стезю…» Приблизительно такими словами начинался каждый доклад пленарного заседания республиканской научно-практической конференции, посвящённой актуальным вопросам германской филологии и методике преподавания иностранных языков. Гости также не упускали случая поблагодарить БрГУ имени А.С. Пушкина за оказанное гостеприимство.

Первым в проблемы германской филологии «окунулся» доцент Киевского государственного университета Р.Е. Пилипенко. По его словам, интерес к германской филологии – «бледной печальной даме» – в мире постепенно угасает, поэтому учёные ищут способ эту даму «развеселить». Теперь лингвистику неотрывно связывают с культурологией и медиаведением, совершенно новой, но необходимой в современном мире наукой.

Профессор МГЛУ Е.В. Зарецкая произвела впечатление, по крайней мере, на начинающих исследователей, уже названием своего доклада – «Стратегический потенциал заимствованной лексики в устном политическом дискурсе». На самом же деле всё оказалось довольно просто. Профессор, анализируя выступления немецких политиков, приоткрыла завесу тайны, почему в устной речи ораторы используют значительно меньше заимствований, нежели в письменной.

Второе пленарное заседание открыл доклад, посвящённый проблемам методики преподавания иностранных языков. А.В. Конышева, профессор Полоцкого государственного университета рассказала о методике составления модульной программы. Мне понравилась идея о модульном обучении тем, что «самостоятельные работы рекомендуется давать с ключами не только в целях экономии времени и энергии преподавателя, но и потому что тот, кто спишет, обязательно запомнит».

Завершила пленарное заседание доцент МГЛУ Н.П. Мартысюк, затронувшая проблему сообщения как минимального вербального компонента общения.

После двух пленарных заседаний участники конференции разделились на секции, и работа продолжилась по разным направлениям. Любой, даже малозаинтересованный в лингвистике либо методике преподавания иностранных языков, мог найти что-то интересное.

День получился очень насыщенным... Опытные сумели заинтересовать начинающих, кое-где даже открыть Америку, заразить своим энтузиазмом, направить в плавание по бескрайнему морю лингвистики…

*М. Вельб (факультет иностранных языков)*

## ФОТАФАКТ

**12 марта на социально-педагогическом факультете состоялась республиканская (с международным участием) научно-практическая конференция «Волонтёрская деятельность студентов: социально-образовательный аспект».**

**К этому важному событию мы готовились долго и тщательно: очень хотелось, чтобы всё прошло хорошо.**

На пленарном заседании, которое открыли проректор по учебной работе университета А.Н. Сендер, начальник отдела по делам молодёжи Брестского облисполкома А.А. Власовец и декан социально-педагогического факультета А.Н. Герасевич, выступали не только преподаватели нашего университета, но и представители Белостокского (Польша) и Волынского национального имени Леси Украинки (Украина) университетов.



После обеда началась работа секций («Роль волонтёрской деятельности в развитии социальной сферы» и «Волонтёрская деятельность студентов как компонент практикоориентированного обучения») и мастер-классов.

Первый мастер-класс под названием «Специфика использования ролевой игры и фильмогруппы в волонтёрской деятельности» провела преподаватель кафедры социально-медицинских дисциплин Т.В. Соколова, второй – «Социально-психологический тренинг в работе с волонтёрами» – показала преподаватель той же кафедры А.Ю. Анацкая.

После конференции её участники с большим удовольствием обсудили дальнейшее сотрудничество по вопросам волонтёрской деятельности.

*Л. Клопот (социально-педагогический факультет)*

## ОБУЧАЙТЕСЬ ON-LINE

***В сети есть безграничное множество каталогов с различными изданиями. Однако книги на иностранном языке найти значительно труднее. На русскоязычных сайтах вы сможете встретить только самые популярные произведения. Поиск книг по немецкоязычным сайтам доступен в значительной степени тем, кто владеет языком. Но заглянуть на подобные странички всё же стоит.***

***Один из лучших сайтов с хорошим каталогом книг – это gutenberg.spiegel.de. Также рекомендую сайт gratistexte.de, где можно найти множество историй, стихов и шуток.***

***Vorleser.net – сайт для любителей аудиокниг, где каждый может найти себе что-нибудь по вкусу.***

***Как оказалось, в интернете можно даже самостоятельно изучать немецкий язык. Примером этому служит курс «Deutsche Welle» (deutschkurse.dw-world.de/KursPlattform/WebObjects/KursPlattform.woa/wo/4.1). Большой его плюс в том, что каждый может начать занятия с удобного уровня.***

*А. Вольная (факультет иностранных языков)*

## ДЗЕ ЯНЫ ЦЯПЕР?

# ВСЁ ПОЛУЧИТСЯ!

**Великолепная женщина, специалист своего дела и просто приятный собеседник… Знакомьтесь – начальник отдела по делам молодёжи Брестского горисполкома, выпускница филологического факультета 2003 года Татьяна Сергеевна Борищик!**

**– Татьяна Сергеевна, почему Вы выбрали именно филологический факультет?**

– По сути своей я гуманитарий. А в школе у меня был замечательный учитель белорусского языка и литературы. Я успешно участвовала во всяческих олимпиадах, рассказы писала в дрогичинскую районную газету. Ещё мне английский язык очень нравился, но специальности «Белорусский язык и литература. Английский язык» тогда не было, поэтому выбор и пал на «Белорусскую филологию».



**– А как Вы попали на должность начальника отдела по делам молодёжи горисполкома?**

– Я участвовала в студенческом самоуправлении на своём факультете. Потом была секретарем первички ОО «БРСМ» нашего родного университета, затем – вторым секретарём областного комитета и несколько позже первым секретарём горкома БРСМ. После всего этого меня назначили начальником отдела по делам молодёжи горисполкома.

**– По-Вашему, молодёжная политика нуждается в каких-либо преобразованиях?**

– Ой, это очень глобальный вопрос… Хотелось бы, наверное, побольше социальных гарантий со стороны государства. Раньше формировались те же отдельные жилищные кооперативы для молодёжи, но сейчас вступил в силу новый законодательный акт, по которому молодые люди становятся на очередь на общих правах. Жаль, конечно…

А вообще, огромное внимание уделяется и самой молодёжи, и различным молодёжным организациям и объединениям. Взять те же студенческие отряды! Когда-то мы под чутким руководством проректора по воспитательной и социальной работе Л.А. Годуйко возрождали эту традицию в нашем университете. Тогда штаб трудовых дел БрГУ имени А.С. Пушкина был признан лучшим в республике! Я горжусь тем, что стояла у истоков возобновления этого движения!

**– Скажите, а чем, на Ваш взгляд, современная молодёжь отличается от своих предшественников 10–15 лет назад?**

– Во все времена молодые люди отличались активностью, прогрессивностью, динамичностью… Сейчас она более открыта, более осведомлена о процессах, происходящих в обществе. Даже, наверное, более активна в своих гражданских проявлениях… Но в целом у нас всегда была замечательная молодёжь: и 10 лет назад, и сейчас!

**– А если бы судьба распорядилась иначе… И вот Вы – выпускница филфака с дипломом на руках… Куда дальше?**

– В идеале нужно было бы сказать, что пошла бы в школу и была бы замечательным учителем белорусского языка и литературы… Но это не так! Скорее всего, пробовала бы себя в журналистике. Я в своё время стажировалась на телевидении. Готовила программы в отделе новостей на «Буге», что у меня неплохо получалось…

**– Скажите, а что у Вас в памяти всплывает в первую очередь при упоминании университета?**

– Декан. Владимир Адамович Сеньковец! Замечательный человек и преподаватель, который научил нас любить свой факультет.

Кафедра белорусского языкознания…Там очень много талантливых личностей – Мария Ивановна Новик в том числе…

Как иногородний студент, тепло вспоминаю жизнь в общежитии на ул. Ленина. Как мы жарили очень вкусную картошку на студенческой кухне. У нас постоянно собирались брестчане, которые завидовали, что мы живём в общаге и что у нас так весело всегда!

**– Ну и напоследок несколько пожеланий нашей alma mater…**

– Процветания! Новаторства! Молодости! 65 лет – это, конечно, серьёзная дата для такого учреждения. Возраст, когда уже можно обратиться к сложившимся традициям. А традиции в нашем университете, безусловно, очень богаты!..

И пусть не все это признают, но Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина – лучший в области!!!

*М. Кравчук*
*(юридический факультет)*

# Недапісаная гісторыя

**Вялікі мітуслівы свет заўсёды жыў сваімі законамі. Л. Бланкі гаварыў, што прыблізіцца да мэты яшчэ не азначае дасягнуць яе – не дайшоўшы адзін крок, можна сустрэць бездань, якую не перайсці. Падчас нашы планы і мары разбіваюцца на безліч кавалачкаў. Нядаўна сама пачула гулкі звон разбітых планаў і адчула цягучую боль ад асабістай бездапаможнасці. У такія моманты як ніколі адчуваеш імклівасць часу і крыўднае, нелагічнае, несправядлівае складванне абставін.**

Збірала матэрыял для спецыяльнай рубрыкі нашай газеты «Праз адлегласць гадоў». Рыхтавалася да сустрэчы з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Як толькі ўзяла яго адрас і тэлефон, адразу ж захварэла і два тыдні не магла нікуды выбрацца. Тады мне здавалася, што два тыдні надвор’я не зробяць, думала, што ў руху вечнасці два тыдні не час. Але я памылялася…

У панядзелак 22 сакавіка (першы дзень ва універсітэце пасля хваробы) вырашыла усё ж сустрэцца з чалавекам, да якога доўга збіралася. Спачатку патрэбна было патэлефанаваць, але баланс быў на нулі, і я зноў чакала… Пасля заняткаў, спусціўшыся на першы паверх, я знерухомела ў нямым шоку.

Такая сумная інфармацыя, на жаль, час ад часу з’яўляецца на інфармацыйных стэндах універсітэта, але зараз я стаяла тут, як укапаная. За чырвонымі гваздзікамі, акуратна сабранымі ў вазе, фатаграфія, прозвішча, імя, а самае галоўнае – дата смерці таго самага ветэрана, да якога я так і не паспела… Закралася шчымлівае адчуванне страты нечага важнага і каштоўнага.

Васіль Цімафеевіч Шымалаў памёр 21 сакавіка. Яшчэ адно жыццё, яшчэ адзін лёс, яшчэ адна легенда з гісторыі той вайны адышла ў небыццё.

Вінавата я ці не? Паспела б я, калі не захварэла? Дарэмныя пытані, якія так і застануцца без адказаў. Адно я ведаю дакладна: я страціла шанс атрымаць ў спадчыну памяць успамінаў, якіх становіцца ўсё менш і менш і якія неабходны нам усё больш і больш. Мая душа стала бяднейшай, бо згубіла магчымасць атрымаць вопыт мудрага чалавека… Стала багацейшым жыццё на мэту, якую мне не суджана было рэалізаваць.

*Г. Лось*
*(юрыдычны факультэт)*

## ПАРАДА ПСІХОЛАГА

***«Родители чрезмерно беспокоятся и заботятся обо мне. Не дают свободы, контролируют каждый мой шаг. Как мне мирным путём им объяснить, что я взрослая?»***

*Степень самостоятельности (взрослости) человека определяется его способностью брать ответственность за свои поступки, материальной и территориальной автономностью. Чрезмерная забота и беспокойство родителей о своих детях могут быть вызваны тем, что взрослые ещё не передали детям в полной мере ответственность за их собственную жизнь, а последние не смогли (или не захотели) принять её в том предлагаемом объёме. Объяснять родителям «мирным путём» можно и словами, и поступками, и результатами тех дел, которые демонстрируют Вашу самостоятельность. Понаблюдайте за собой:*

*– доводите ли Вы начатое до логического завершения;*

*– не нарушаете ли Вы свои обещания;*

*– пытаетесь ли договориться, учитывая точку зрения другого (в том числе и Ваших родителей);*

*– способны ли Вы иногда в чём-то уступать;*

*– заботитесь ли самостоятельно о собственном здоровье.*

*Не забывайте: такое наблюдение потребует от Вас определённого времени и немало сил. Готовы ли Вы к этому? Если «да», то стройте свои новые отношения с родителями на взаимной любви, доверии и сотрудничестве.*

***Е.А. Корзун***
***(педагог-психолог ПС)***

## ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ

**Не так уже часто у нас проводятся спортивные соревнования среди работников университета. А вот первенство по подлёдному лову рыбы уже имеет свою историю, свои традиции.**

# ПАМЯТИ КОЛЛЕГИ



В середине марта соревнования, посвящённые памяти А.Д. Городника (*с 1952 по 2002 гг. плодотворно работал старшим преподавателем, заведующим кафедрой физической культуры. – И.Д.*), прошли на озере Луковском уже в шестой раз.

Собрались, в основном, постоянные любители зимней рыбалки. Среди них – А.Д. Сокожинский, П.И. Корнев, Т.В. Пивоварук, Н.В. Кудин, С.В. Наумовец. Хотя нужно сказать, часто никакие знания и опыт на рыбалке не помагают. Ну не клюет, и всё тут!

И всё же сработала правильно выбранная тактика. Одно дело бурить лунки на приличной глубине (7–9 м) и ждать поклёвки леща, другое – искать рыбу ближе к берегу, где клюют экземпляры поменьше, но чаще. На сей раз «лещатники» (в их числе и автор этих строк) потерпели фиаско. Другие оказались в числе лидеров.

Победителем первенства уже четвёртый раз стал преподаватель кафедры физической культуры А.Д. Сокожинский с уловом в 1850 граммов. Второе место у заведующего кафедрой методики преподавания математики Т.В. Пивоварук (на фото) – чемпионки первых соревнований 2003 г. Третье место занял доцент кафедры истории славянских народов П.И. Корнев.

Все победители награждены грамотами и ценными призами профкома работников. По просьбе всех участников-рыболовов выражаем благодарность руководству университета за предоставленную возможность проведения соревнований.

***И.С. Дмитроченко***
***(доцент кафедры физической культуры, главный судья первенства)***

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Если вы думаете, что студенты факультета иностранных языков знакомы только с зарубежной музыкой, то вы ошибаетесь. Это доказал караоке-конкурс, прошедший 25 февраля в общежитии № 4.**

# ПОЁМ ВМЕСТЕ!

Студенты-участники прямо-таки поразили своей эрудированностью: они не только без труда отгадывали песни по первому аккорду, но и блестяще исполняли многие из них, не подглядывая в текст (учтите, что спеть предлагалось песни как минимум двадцатилетней давности). В тот день многие раскрыли в себе музыкально-вокальный талант, а некоторым с особенно активной жестикуляцией, как оказалось, стоит подумать о танцевальном поприще.

Победила, как это часто бывает, дружба. Участники остались довольны. Кому-то не хотелось спешить и спеть ещё парочку песен, а кто-то, пеняя на то, что в 11 часов не будет горячей воды, поспешил ретироваться. Но почему-то я не задаюсь вопросом, пели или нет последние в душе тем вечером.

***К. Мариневич***
***(факультет иностранных языков)***



«Берасцейскі універсітэт» № 13 (133)

**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – Р.У. Хрыстафораў.
Карэктар – К.В. Каханчык.
Куратар – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 31.03.2010 г.
Аб'ём 1 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 133.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***